ДУК "Слонімская раённая бібліятэка імя Я.Коласа"
Філіял "Гарадская бібліятэка №2"

# Мой старадаўні, родны Слонім!

Кароткі гістарычны нарыс



Слонім 2019

Складальнік і рэдактар А.В. Лепко

Карэктар Л.А. Старадубцава

Дызайн Ю.У. Домаш

Адказны за выпуск Л.І. Ціханчук

**ДУК «Слонімская раённая бібліятэка імя Я. Коласа»**

**Філіял «Гарадская бібліятэка №2»**

231800 Гродзенская вобласць, г. Слонім, вул. Брэсцкая, 69/1

Тэлефон: 8 (01562) 2-49-71

**e-mail:** biblioteka_1974@mail.ru

**ДУК «Слонімская раённая бібліятэка імя Я. Коласа»**

**Філіял «Гарадская бібліятэка №2»**

# *Мой старадаўні, родны Слонім!*

Кароткі гістарычны нарыс

**Слонім 2019**

Мой старадаўні, родны Слонім!: кароткі гістарычны нарыс / ДУК "Слонімская раённая бібліятэка імя Я. Коласа"; філіял "Гарадская бібліятэка №2"; склад. і рэдактар А.В. Лепко, карэктар Л.А. Старадубцава, дызайн Ю.У. Домаш. — ДУК "Слонімская раённая бібліятэка імя Я. Коласа", Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, 2019. — 12с.

Кароткі гістарычны нарыс створаны з мэтай папулярызацыі краязнаўчых ведаў. Разлічаны на шырокае кола чытачоў і адрасаваны ўсім тым, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай роднага краю.

11. Слонимский район // Пресс-тур в глубинку: информационный проект Министерства информации Республики Беларусь и белорусской прессы. – Минск: Международный центр интеграционной информации. Общественный пресс-центр Дома прессы, 2006. – С. 130-159.

12. Супрун, В.Р. Дзеі над Шчарай: ( З гісторыі зямлі Слонімскай) / Васіль Супрун. – Слонім: ГАУПП "Слонім. друк.", 2000. – 167.с., іл.

13. Чыгрын, С. Гісторыя Слоніма на старых фотаздымках і паштоўках (1900-1950) / Сяргей Чыгрын. – Мінск: "Кнігазбор", 2014. – 92с.

14. Чыгрын, С. Слонімскі буквар: даведнік па горадзе Слоніме і раёне / Сяргей Чыгрын. – Мінск: "Кнігазбор", 2013. – 64с.

15. Чыгрын, С. Тэатральны Слонім // Культура Гродзеншчыны. Факты. Падзеі. Асобы / уклад. Л.В. Мальцава. – Мінск: Выдавецкі дом "Звязда", 2014. – С. 156-161.















Бібліяграфія:

1. Волковысско-Слонимский локальный район // Туристическая мозаика Беларуси / редкол.: А.И. Локотко и др. – Минск: Беларуская навука, 2011. – С. 334-340.
2. Кахаю пяшчотна чароўны мой Слонім (Слонімшчына ў творах землякоў): бібліяграфічны спіс літаратуры да 760-годдзя з першага летапіснага ўпамінання г.Слоніма / склад. Алена Лепко. – Слонім: ГУК “Слонімская раённая бібліятэка імя Я. Коласа” філіял “Гарадская бібліятэка № 2”, 2012. – 18 с.
3. Лойка, А. Роднае: Трыпціх / Алег Лойка // Выбр. тв.: У 2 т. Т. 2. – Мінск, 1992. – С. 335-361.
4. Памяць. Слонімскі раён. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 752с.: іл.
5. Слонім // Культура Беларусі: энцыклапедыя. Т. 6. / рэдкал.: У.У. Андрыевіч і інш. – Мінск, 2015. – С. 360-362.
6. Слоним // Регионы Беларуси: энциклопедия. В 7 т. Т. 4. Гродненская область. В 2 кн. Кн. 2. / редкол.: В.В. Андриевич и др. – Минск, 2014. – С. 350-374.
7. Слоним // Республика Беларусь: энциклопедия. В 6 т. Т. 6. / редкол.: Г.П. Пашков и др. – Минск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2008. – С. 706-716.
8. Слонім // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. Кн. 1. – Мінск: “Беларуская энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі, 2001. – С.336-343.
9. Слонімская балетная школа. Слонімскі беларускі драматычны тэатр. Слонімскі народны тэатр. Слонімскі тэатр Агінскага. Слонімскі школьны тэатр // Тэатральная Беларусь: энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2003. – С. 353-355.
10. Слонімскі раён // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя. Т. 9. Гродзенская вобласць. Кн. 3. / рэдкал.: У.У. Андрыевіч і інш. – Мінск, 2017. – С. 337-442.




Хочаш вывучыць гісторыю і культуру сваёй краіны – выпраўляйся ў падарожжа. Куды варта абавязкова патрапіць, дык гэта ў горад Слонім.

“Шлейф” гісторыі спалучыце з ціхмяна-задуменнымі краявідамі ракі Шчары – і, запалоненыя прыгажосцю і веліччу роднай зямлі, вы адчуеце сваю моцную далучанасць да яе жыцця – мінулага (бо тое за гонар) і сённяшняга (жаданне зрабіць свой унёсак).



… Я вырас, захапляючыся тут
Высокім небам, Шчары ціхім звонам.
І сэрцам палюбіў я родны кут –
Цябе, мой старажэтны, родны Слонім!

Алег Лойка.

Горад Слонім, вядомы з XI стагоддзя, згаданы ў Іпацьеўскім летапісе пад 1252 годам пад назвай “Услонім”, “Вослонім”, зведаў усе капрызы гісторыі. Адразу горад апынуўся ў цэнтры бурных ваенна-палітычных падзей, якія разгарнуліся ў сувязі з барацьбой галіцка-валынскіх і літоўскіх князёў за валоданне Панямонскім краем. У сярэдзіне і другой палове XIII стагоддзя ён некалькі разоў пераходзіў ад галіцка-валынскіх да літоўскіх князёў і наадварот. У другой палове XIII стагодзя Слонім увайшоў у склад ВКЛ пад час кіравання князя Войшалка, сына Міндоўга.

Адзін з багатых і квітнеючых гарадоў Панямоння – Слонім і на пачатку XV стагоддзя заставаўся значным ваенным умацаваннем. Невыпадкова Слонімская харугва (полк) брала ўдзел у Грунвальдскай бітве, калі аб'яднаныя войскі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага 15 ліпеня 1410 года разбілі крыжакоў. І з гэтага часу па дазволу князя Вітаўта ў Слоніме пачалі сяліцца татары, пазней з'явілася вуліца Татарская ( цяпер вуліца Кірава).

У XVI стагоддзі ўзрасло значэнне Слоніма як цэнтра рамёслаў і гандлю, таму ў 1531 годзе горад атрымаў Магдэбургскае права. З 1586 года старастам слонімскім стаў Леў Сапега, які затым з'яўляўся канцлерам ВКЛ. Новы староста спрыяў уздыму культуры і прамысловасці Слоніма, яго палітычнай значнасці. На беразе Шчары Сапега ўзвеў вялікі мураваны палац у якім праводзіліся генеральныя сеймікі ВКЛ. Пра Льва Сапегу і сёння нагадвае стары герб Слоніма дадзены па яго хадатайству каралем Жыгімонтам III 4 студеня 1591 года.



*Роднасць наша*

*Самая блізкая —*

*Слонім*

*І паланэз Агінскага…*

*Сяргей Чыгрын*



Багата Слонімская зямля і на цудоўныя архітэктурныя помнікі. Жамчужынамі дойлідства з'яўляюцца: касцёл і кляштар бернардінцаў (пабудаваны ў першай палове XVI стагоддзя, цяпер Троіцкая праваслаўная царква); будынак сінагогі (1642г.) – помнік архітэктуры барока; касцёл бернардзінак з кляштарам (1664-1670гг., зараз дзейнічае). Уражвае сваёй узнёслай прыгажосцю касцёл Святога Андрэя, закладзены ў 1490 годзе Казімірам IV Ягелончыкам. Паспрыяла развіццю Слоніма і недалёкая адлегласць ад Жыровіц з іх вядомай праваслаўнай святыняй – Жыровіцкім манастыром, з цудоўным абразом Маці Божай. Па свайму канфесійнаму складу Слонім складаецца з вернікаў – католікаў, праваслаўных, мусульман, яўрэяў.







У нашым горадзе можна атрымаць, як прафесійную адукацыю: у Мінскай духоўнай семінарыі, Слонімскім духоўным вучылішчы, Жыровіцкім дзяржаўным аграрна-тэхнічным каледжы, Слонімскім дзяржаўным медыцынскім каледжы, Слонімскім дзяржаўным палітэхнічным прафесійным ліцэі, Слонімскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы сельскагаспадарчай вытворчасці.

Сёння Слонім адзін з найбольш развітых у прамыслова-культурных адносінах горад Гродзенскай вобласці. Тэрыторыя раёна складае 1,5 тыс. кв. км. У 147 населеных пунктах (уключаючы г.Слонім) жыве больш за 63 тысяч чалавек. Слонім размешчыны ў даволі маляўнічым кутку Беларусі. На Слонімшчыне працякаюць 30 рэк (Шчара, Іса і інш.), 40 крыніц, ёсць чатыры возеры, шмат вадаёмаў і навакольных ландшафтаў надаюць яго абліччу яшчэ адну прывабную рысу.

Самаадданай працай жыхары раёна адбудавалі горад і вёскі, аднавілі гаспадарку. З 8 студзеня 1954 года Слонімшчына адносіцца да Гродзенскай вобласці.

70 слонімцаў за самаадданую працу ўдастоены званняў “Заслужаны работнік” у розных галінах. 26 слонімцаў былі ўдастоены самай высокай узнагароды СССР – ордэна Леніна, 17 з іх – сяляне, чацвёра якіх – з калгаса “Дружба” (цяпер СВК “Дружба-Агра”).

Слонімшчына ўзгадавала вядомых дзяржаўных дзеячаў (Л.С. Мальцаў, П.Р. Чаус, Л.І. Харужык і інш.), вайскоўцаў (адмірал В.Н. Апановіч, генералы М.С. Уласік, У.В. Корчыц і інш.), навукоўцаў (М. Аляхновіч і інш.), гісторыкаў і даследчыкаў краю (В. Стаброўскі, В. Мялешка, В. Супрун, С. Чыгрын і інш.), скульптараў (І.Я. Міско, Л. Богдан), мастакоў (М. Бушчык і інш.), літаратараў і паэтаў (А. Іверс, В. Таўлай, А. Сучок, С. Дарожны, М. Арочка, А. Лойка, і інш.), артыстаў (У. Антонік і інш.), спартсменаў (У. Раманоўскі, І. Ціхан і інш.)

У Афганістане загінулі 6 слонімцаў: У.У. Комлеў, М.І. Кузьміцкі, С.С. Мыслівец, А.І. Скок, А.Р. Супрун, І.Т. Ясюкевіч.







Дальнейшы росквіт Слоніма звязаны з дзейнасцю яго старасты Міхала Казіміра Агінскага (1728-1800), дзяржаўнага дзеяча, кампазітара, пісьменніка, мецэната, дзядзькі слыннага кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага. Вялікі гетман літоўскі Міхал Казімір Агінскі ў другой палове XVIII стагоддзя заснаваў тут сваю рэзідэнцыю. Ён стварыў у горадзе друкарню, капэлу і тэатр, пабудаваў мануфактуру дываноў і канал, які злучыў прыток Прыпяці Ясельду са Шчарай, і наогул праз так званы “малы канал Агінскага”, Балтыйскае і Чорнае мора. І доўгі час Слонім быў партовым горадам, праз горад хадзілі гружоныя баржы, а па выхадных днях можна было здейсніць прагулку па каналу. З іменем М.К. Агінскага звязана дзейнасць Слонімскага прыдворнага тэатра, створанага каля 1771 года, у якім выступалі прафесійныя італьянскія, нямецкія, польскія выканаўцы і меліся свае прыгонныя хор і балет, музычная школа, нават “плывучы тэатр” на баржах на Агінскім канале (зноў-такі, і канал створаны ўсё з той жа ініцыятывы). Пры тэатры Агінскага існавала балетная школа, выхаванцы якой паспяхова сапернічалі з зоркамі каралеўскага балета ў Варшаве. Дарэчы, у Слоніме і сёння ёсць свой драматычны тэатр, заснаваны 1 студзеня 1990 года на базе народнага.

У 1795 годзе г. Слонім увайшоў у склад Расійскай імперыі. У гэты ж час ён стаў цэнтрам губерніі, у склад якой увайшлі Брэсцкі, Кобрынскі, Пружанскі, Ваўкавыскі, Слонімскі, Лідскі, Навагрудскі і Гродзенскі паветы. Аднак у ролі губернатарскага горад заставаўся нядоўга. У снежні 1796 года ён стаў павятовым горадам.

Не абышлі бокам Слонім і падзеі вайны 1812 года. Праз Слонім рухалася другая армія П. Баграціёна. Горад быў заняты аўстрыйскімі войскамі.

Вялікую ролю ў развіцці прамысловасці горада ў XIX – пачатку XX стагоддзя адыгралі буйныя землеўладальнікі Пуслоўскія, якія адкрылі ў прыгарадзе Слоніма – Альбярціне – медную, дывановую і лесапільную мануфактуры. У першай палове XIX стагоддзя быў створаны прыгожы сядзібна-паркавы комплекс “Альбярцін” у стыле позняга класіцызму. Слонімскай сядзібе “Альбярцін” прысвяціў свой малюнак знакаміты мастак Напалеон Орда ў 1877 годзе. У 1880 годзе праз Слонім прайшла чыгуначная дарога Слонім- Беласток.

Адзін з прыкладаў простага і строгага барока – касцёл святога Андрэя, які знаходзіцца на так званым “замосці”, месцы якое таксама лічыцца, як археалагічны помнік, магчыма тут і пачынаўся Слонім. Захаваліся таксама барокавыя будынкі двух касцёлаў і кляштараў бернардзінак і бернардзінцаў (у апошнім – цяпер Троіцкі праваслаўны сабор).

Пад час Першай Сусветнай вайны Слонім быў акупіраваны ў пачатку верасня 1915 года кайзераўскімі войскамі. Па мірнаму дагавору, падпісанаму у Рызе 18 сакавіка 1921 года, Слонім разам з іншымі гарадамі і раёнамі Заходняй Беларусі адышоў да Польшчы.

Вядомы пісьменнік Уладзімір Караткевіч некалі захапляўся Слонімскім краязнаўчым музеем, адчыненым у 1929 годзе па ініцыятыве Іосіфа Стаброўскага, удзельніка Першай Сусветнай вайны, палкоўніка, які сабраў вялікую калекцыю гісторыка-археалагічных матэрыялаў. Іосіф Стаброўскі быў у свой час дырэктарам і захавальнікам музея.

Горад звязаны з імёнамі многіх цікавых людзей. Літаратуразнаўцы ведаюць, што ў Слоніме, у доме на ўзгорку, насупраць Ружанскіх могілак, да вайны жыла Ядвіся Бараноўская – прататып Ядвісі з аповесці “У палескай глушы” Якуба Коласа (яна і сама спрабавала пісаць вершы, якія пад псеўданімам Юстына змяшчала ў “Нашай Ніве”).



Вучні сярэдняй школы №1 (зараз УА “Слонімскі раённы ліцэй”) ганарацца тым, што ў будынку іх школы мясцілася польская настаўніцкая семінарыя, дзе ў 1925 годзе вучыўся будучы паэт Валянцін Таўлай (у 1929 годзе ён сядзеў у слонімскім астрозе).

Са Слоніма паходзяць беларускія паэты Сяргей Дарожны і Гальяш Леўчык. Тут у 1931 годзе нарадзіўся Алег Лойка – вядомы паэт і літаратуразнаўца (ён таксама вучыўся ў СШ №1).

Нейкі час у мясцовым краязнаўчым музеі працаваў паэт Сяргей Новік-Пяюн, які ў гэтым горадзе напісаў некалькі вальсаў, адзін з іх, вядомы – “Над Шчарай” – прысвечаны Слоніму.

18 верасня 1939 года Слонімскі раён сустракаў байцоў Чырвонай Арміі.

15 студзеня 1940 года ўтвораны Слонімскі раён у складзе Баранавіцкай вобласці. Пасля аб’яднання Беларусі прайшло мала часу, і мірнае жыццё слонімцаў перарвала Вялікая Айчынная вайна. За годы акупацыі нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі звыш 44,5 тысяч чалавек мірных жыхароў раёна. У кіламетры ад горада, на Пятралевіцкай гары, расстраляна больш за 10 тысяч чалавек, на Чапялёўскіх палях – 30 тысяч, урочышча Маргі – 2 тысячы чалавек. Фашысты знішчылі разам з жыхарамі вёскі: Акунінава, Ніз, Васілевічы, Рудня, урочышча Андрэева. Усяго 31 вёска была знішчана фашыстамі. Жыхары раёна далі ворагу дастойны адпор. 10 ліпеня 1944 года савецкія войскі з дапамогай партызан вызвалілі Слонімшчыну ад гітлераўскіх захопнікаў.



